ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Чырвоная Зьмена

№ 90 (1359) НЯДЗЕЛЯ, 19-га красавіка 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90
6 месяцаў . . . 1 р. 80
1 год . . . 3 р. 60
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.
Кошт асобнага №—2 кап.

СЛУХАЙЦЕ! СЛУХАЙЦЕ! СЛУХАЙЦЕ!

Сёньня а 7-й гадзіне ўвечары
— АДБУДЗЕЦЦА —
УСЕБЕЛАРУСКІ АГУЛЬНЫ РАДЫЁ-СХОД
комсамольцаў і чытачоў „Чырвонкі", прысьвечаны 10-гадоваму юбілею старэйшай комсамольскай газэты—„Чырвонай Зьмены".
У сходзе ўдзельнічаюць Менск, Віцебск, Гомель, Орша, Слуцак, Дрыса, завод „Кастрычнік" (Сьвіслач).
Пасьля сходу—концэрт.
Настрайвайцеся на радыё-хвалю 700 метраў

Дэклярацыя ваяўнічага вялікадзяржаўнага шовіністага

На агульным фоне разгорнутага ацыялістычнага наступленьня, на гульным фоне абвастрэньня кляавай барацьбы, мы ў апошні час устракаемся з больш частымі выдкамі варожых вылазак супроць эвінскай нацыянальнай політыкі.

Бальшавіцкае ажыцьцяўленьне ацыянальнай політыкі, якая зьяўяецца органічнай часткаю генэральай лініі нашай партыі, выклікае алёнае супраціўленьне клясава-варожых контрэволюцыйных элемэнтаў.

У Районо Житковичского района
от М. Чудина

ЗАЯВЛЕНИЕ

Прошу Районо снять меня с работы, потому что я не могу работать в качестве учителя, об этом могут вам сказать и дети. Во-вторых, не хочу жить в Белоруссии там, где проводится искусственная белоруссизация. Хочу работать на производстве в РСФСР. Белорусский язык не жизненный. Нікто на нём не говорит. Ведь результаты того, что я не могу говорить по русски это только благодаря белоруссизации.

Все школы как национальные, так и белорусские мы должны постепенно руссифицировать.

Выходя из моей неподготовленности и политических соображений, прошу Районо снять меня с работы, в противном случае, я самовольно уеду.

М. Чудин

8-IV-31 г.

Заява „настаўніка „комсамольца" удзіна—гэта дэклярацыя ваяўнічага вялікадзяржаўнага шовіністага, чна заявіўшага аб сваіх антысацкіх, клясава-варожых адносінах беларусізацыі, да нацыянальнай олітыкі партыі. Чудзін, бачыце, хоча жыць „там, где проводится скусственная белоруссизация". Ён эўнены, што „белорусский язык жизненный" (!!?) „Никто на нем говорит" (!!).

Асьлеплены масавай ненавісьцю, удзін ганьбіць політыку партыі і аду, дзякуючы якой БССР перараецца з краіны экономічна і ультурна адсталай у экономічна ацную, вытворчую, а ў культурых адносінах хутка ідзе ўперад.

Выконваючы соцыяльны заказ лясавага ворага, Чудзін не абмяэўваецца толькі нянавісьцю і абуньнем з прычыны „искусственй" беларусізацыі. Ён прапануе м каардынальнейшы сродак, выабаваны польскім фашызмам у ходняй Беларусі і царскім рэжым — русыфікаваць беларускія колы.

Чудзін разгарнуў ва ўсёй шынні антысавецкую програму, якая кладзена з паклёпніцкіх, контррэлюцыйных аргумэнтаў.

У адказ на гэтыя паклёпніцкія, онтррэволюцыйныя вылазкі яшчэ льш моцна і жорстка будзем насіць удары па Чудзіных, носьбіх вялікадзяржаўнага шовінізму—лоўнай небясьпецы ў даны монт, па контрэволюцыйным беарускім нацыянал-дэмократызьме і овінізмах розных колераў.

Комсамольскія організацыі Беларусі на гэтым конкрэтным факце лазкі клясавага ворага павінны шчэ больш мобілізавацца і мобілізаваць працоўную моладзь на бязьітасную барацьбу на ленінскую ацыянальную політыку.

Да другой гадавіны соцыялістычнага спаборніцтва

СОЦСПАБОРНІЦТВА І УДАРНІЦТВА НА ВЫШЭЙШУЮ СТУПЕНЬ

45%, 518 і 1040 патрабуюць ударніка-рацыяналізатара, ударніка барацьбіта за тэхніку, за тэмпы плюс якасьць

Засталося толькі 10 дзён да сьвяткаваньня другой гадавіны соцспаборніцтва.

Да гэтай гадавіны мы падыходзім з вялікімі дасягненьнямі. Мы дасягнулі тэмпаў, якіх ня ведаў сьвет, мы будуем 518 новых гігантаў індустрыі, новых 1040 МТС, якія хваляй трактарных калён канчаткова зьнясуць з твару савецкай зямлі вузкія палоскі і межы.

Побач з гэтымі дасягненьнямі, мы падыходзім з буйнымі прарывамі на фронце барацьбы за якасьць.

Разгорнуты, па ініцыятыве комсамольцаў Віцебскай абутковай фабрыкі імя Пекерта і „Чырвонай Зьмены", конвэер якасьці ўнёс значную перамену ў сыстэму працы прадпрыемстваў, у іх барацьбу за бальшавіцкую якасьць і тэмпы.

Аднак, апошнія дні далі значнае паслабленьне ў галіне разгортваньня конвэеру якасьці. Ленінскі комсамол павінен перакінуць конвэер на усе галіны вытворчасьці, ператварыць яго ва ўсесаюзны паход за якасьць продукцыі. за зьніжэньне сабекошту.

Паход за тэхніку стаў вялікім вагаром у барацьбе за авалоданьне тэхнікай, будаўніцтва рашаючага году, ператварыўся ў масавы паход за тэхніку рабочай моладзі на чале з комсамолам.

Другая гадавіна соцыялістычнага спаборніцтва, дзесяцігадовы юбілей „Чырвонай Зьмены" павінны быць адзначаны новай хваляй соцспаборніцтва, стварэньнем ударных штурмавых брыгад па барацьбе за ўзорную продукцыю і зьнішчэньне браку, за рацыяналізацыю вытворчасьці і масавы адказ на адозву тульскіх рабочых выкананьнем і перавыкананьнем бальшавіцкіх пляноў.



Вынікі напружанай працы ударнікаў цэхоў, выпушчаныя ў ударным квартале звыш пляну камнядрабілкі...

Соцыялістычную рацыяналізацыю—на службу пяцігодкі

17 красавіка пачала сваю працу конфэрэнцыя па рацыяналізацыі машынабудаўнічай прамысловасьці. На конфэрэнцыі прысутнічаюць прадстаўнікі ўсіх машынабудаўнічых заводаў Белмэталяаб'яднаньня.

Вынікі рацыяналізатарскай працы па машынабудаўнічай прамысловасьці Белмэталяаб'яднаньня зусім не забясьпечваюць выкананьня пляну зьніжэньня сабекошту, Пляны працы бюро рацыяналізацыі шэрагу заводаў не прадугледжваюць выкананьня вызначанага плянам процанту зьніжэньня сабекошту.

Пытаньне рацыяналізацыі вытворчасьці складаецца з моманту рацыяналізацыі тэхнічных працэсаў вытворчасьці і рацыянальнай організацыі працы. Калі пытаньнем рацыяналізацыі і ўдасканальваньня тэхнолёгічных працэсаў бюро рацыяналізацыі займаюцца, дык пытаньню рацыянальнай організацыі працы не зварачваецца належнай увагі.

Дрэнная організацыя працы значна адбіваецца на сабекошту продукцыі. Рацыяналізацыя працы—адзін з элемэнтаў зьніжэньня сабекошту вытворчасьці.

Спэцыялізацыя заводаў дасьць магчымасьць значна зьнізіць сабекошт продукцыі, падвысіць вытворчасьць працы за лік прыстасаваньня рабочых да пэўных процэсаў і рацыяналізацыі гэтых процэсаў.

Спэцыялізацыя заводу — чарговая ўдарная задача. Белмэталяаб'яднаньне павінна практычна прыступіць да непахіснага правядзеньня ў жыцьцё спэцыялізацыі заводаў у самы кароткі тэрмін. Конфэрэнцыя скажа сваё слова па гэтаму пытаньню.

Справа рацыяналізацыі — адсталы вучастак. Але і на гэтым вучастку мы маем прыклады добрай працы, мы маем дасягненьні, як'я павінны быць распаўсюджаны на ўсю прамысловасьць.

У фойэ—выстаўка праведзеных у жыцьцё рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў.

„Пэдаль прагравацеля. Брак па віне фармаўшчыка", „Шатун насоса зламаны па віне каваля. Дрэнная зварка".

Ізьедзеныя ў ракавінах чыгуныя дэталі, зламаныя дэталі.

Цікавы экспонат выстаўкі. „Таямніцы завадзкіх свалак":

Кубамэтраў свалачных месц—56 тысяч. Пры раскопцы аднаго кбм—было знойдзена 1200 грамаў жалеза і 2100 гр. чыгуна, усяго 67,2 тн. Па сорак р. тона—2688 р. на свалцы.

Чыгуна 117,6 тн. па 60 р. тн.—7056 р. на свалцы.

Красамоўныя факты злачыннай бязьдзейнасьці.

А. С.

Патрэбен ударнік—плянавік, рацыяналізатар, тэхнік

На раённай конфэрэнцыі ўдарнікаў рабочае моладзі Бабруйску былі пастаўлены пытаньні аб выніках выкананьня прамфінпляну за пер-



...ня сталі ў старой пяцігодкі

шы квартал і аб правядзеньні прамполітбою.

Рапартуюць лічбы: завод „Чырвоны Харчавік", Шчацінная фабрыка—выканалі і перавыканалі прамфінплян першага кварталу. Комбінат выканаў на 84 проц., швэйная фабрыка Дзяржынскага на 83 пр., фанерны завод на 87 проц. Зусім адстае машынабудаўнічы завод, які выканаў прамфінплян кварталу ўсяго на 50 проц.

Прычыны невыкананьня прамфінпляну—адсутнасьць барацьбы з прагуламі, якія ўзраслі за апошні час з 12 да 16-ці процантаў, недастатковая праца сярод ударнікаў, агульная колькасьць якіх дасягае 30 проц., слабая барацьба з ілжэўдарніцтвам. Значна павысіўся сабекошт продукцыі і зусім нездавальняюча якасьць.

Як дакладчыкі, так і выступаўшыя ў спрэчках значную ўвагу ўдзялілі разгортваньню паходу за тэхніку. Конфэрэнцыя сыгналізавала аб наяўнасьці прарыву ў гэтай галіне.

Ініцыятыву комбінату ў галіне паходу за тэхніку амаль ніводная комсамольская ячэйка не падхапіла. Некаторыя комсамольцы недаацэньваюць важнасьці вывучэньня тэхнікі. Комсамольцы-швэйнікі кажуць, што ім няма чаго вывучаць. Фанэршчыкі гавораць аб тым, што ў іх ламаныя машыны, дык і тэхніку вывучаць не трэба.

Адсюль відаць, што ня ўсе яшчэ комсамольцы і рабочая моладзь уцямілі важнасьць авалоданьня тэхнікай. Не дарма дакладчыкі адзначылі, што сёньня мала гаварыць аб утварэньні тэхнічных гурткоў, нам патрэбны ўдарнік-плянавік, ударнік-рацыяналізатар, ударнік-тэхнік.

Конфэрэнцыя маладых ударнікаў Бабруйшчыны паслала прывітальную тэлеграму штабу ленінскага комсамолу і рабочай моладзі Беларусі—ЦК ЛКСМБ і яго баявому органу—„Чырвонай Зьмене".

Ф. Хазанаў.

Комунары ў авангардзе

Па ініцыятыве комсамольскага колектыву, на Менскай фабрыцы „Чырвоны Тэкстыльшчык" 1-га мая 1930 году організавалася першая вытворчая комуна з 12 асоб.

Гэта быў першы вопыт колектыўнай працы на фабрыцы, Складзеная амаль выключна з моладзі комуна ўзялася з энтузіязмам за выкананьне прамфінпляну. за барацьбу за якасьць продукцыі.

Ударнаю працаю комуна даказала ўсім рабочым фабрыкі, што яна здольна змагацца за тэмпы. За гэты год на фабрыцы організаваны 14 вытворчых комун з 68 чалавек.

Комуны, як вышэйшая форма соцыялістычнага спаборніцтва, апраўдалі сябе поўнасьцю. Работніцы, якія раней ня выконвалі прамфінплян, пасьля ўступленьня ў комуну, дзякуючы разгортваньню соцспаборніцтва перавыконваюць яго. Так, напрыклад, тав. Дзятлікевіч раней ніколі ня выконвала прамфінплян, а зараз перавыконвае і лічыцца лепшай ударніцай.

Вытворчыя комуны сталі ініцыятарамі павышэньня нормы і зьніжэньня расцэнак.

Упартай барацьбою за тэмпы, за якасьць. рабочыя нашай фабрыкі ліквідуюць прарыў і выконваюць прамфінплян 3-га рашаючага году пяцігодкі.

П. Ч. З.

За экономію матэрыялаў

Гута „Труды" адчувае вялікі недахоп у сыравіне для выпрацоўкі шкла. Тая нязначная колькасьць сыравіны, якую завод атрымлівае, не скарыстоўваецца рацыянальна. Адзін з галоўных цэхаў заводу састаўны. Але тут няма ніякага надзору над складаньнем раствору шкла.

Былі выпадкі, калі ў склад шкла ўжывалі матар'ялаў па 30 кгр. звыш нормы. У выніку—шкло дрэннай якасьці, вялікі процант браку. А гэта вельмі балюча адбіваецца на выкананьні прамфінпляну, бо заводу і так не хапае сыравіны.

Ключ.



...Горы браку запаўняюць завадзкія карпусы
Як вы нясеце атрыманы за перамогу ганаровы сьцяг ЦК ЛКСМБ?

БУДЗЕМ НАПАГАТОВЕ,
каб даць рашучы адпор інтэрвэнтам

Нарада сэкратароў комсамольскіх ячэек Менскай організацыі, заслухаўшы інформацыйнае паведамленьне аб падзеях у Заходняй Беларусі і Зах Украіне, выражае свой гнеўны протэст супроць узрастаючага белага тэрору польскіх окупантаў у адносінах да мільённых мас працоўных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Гэты тэрор фашыстых, які ўсё болей абвастраецца, сыстэма луцкіх, кобрынскіх і лідзкіх катаваньняў рабочых, сялян і працоўнай моладзі, перапоўненыя турмы, разгромы нацыянальна-вызваленчых організацый—цесна зьвязаны з ваеннымі падрыхтоўкамі польскага імпэрыялізму да нападу на СССР.

Польскія імпэрыялістыя шукаюць выхаду з крызісу ў вайне супроць СССР. Шляхам вайны яны імкнуцца зьнішчыць пролетарскую дыктатуру ў БССР і ў СССР, з тым, каб заваяваць рынкі, каб ператварыць іх у свае колёніі. Падрыхтоўваючы гэтую вайну, окупанты імкнуцца задушыць рэволюцыйны рух працоўных Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны і Польшчы.

Гэтая політыка тэрору, голаду, беспрацоўя і вайны, політыка эксплёатацыі працоўных актыўна падтрымліваецца соцыял-фашыстымі, беларускімі нацыянал-фашыстымі і іх контррэволюцыйнымі організацыямі моладзі. Але ня гледзячы на тэрор, ня гледзячы на ўсе ашуканчыя фразы і манэўры соцыял і нацыянал-фашыстых рэволюцыйны рух у Польшчы і Заходняй Беларусі расьце і пашыраецца нябачанай магутнай хваляй. Пролетарская моладзь разам з усімі працоўнымі над кіраўніцтвам комуністычнае партыі ўсё больш востра і актыўна выступае супроць фашысцкай дыктатуры, яе ваенных плянаў, у абарону СССР. Роля комсамолу Польшчы і комсамолу Заходняй Беларусі ўзрастае ў масах працоўнай моладзі.

Мы ўважліва сочым за героічнай барацьбою нашага брацкага комсамолу Заходняй Беларусі.

Мы шлём наша рэволюцыйнае прывітаньне правадыром усяго рэволюцыйнага руху Заходняй Беларусі і Польшчы—компартыі Польшчы і компартыі Заходняй Беларусі.

Мы заклікаем комсамольскую організацыю ўзмацніць і пашырыць нашу работу па інтэрнацыянальнаму выхаваньню, зьвязаць яе з популярызацыяй работы і барацьбы комсамолу Заходняй Беларусі і Польшчы.

Наш абавязак перад комсамольцамі Заходняй Беларусі—паставіць на неабходную вышыню інтэрнацыянальнае выхаваньне організацый, баявое выкананьне ўсіх пастаноў апошніх зьездаў комсамолу, у прыватнасьці пастаноў па пытаньнях умацаваньня абароназдольнасьці Савецкага Саюзу, выканаць усе гаспадарчыя, політычныя і культурныя задачы, якія стаяць перад комсамолам у трэцім, рашаючым годзе пяцігодкі, годзе завяршэньня пабудовы фундаманту соцыялістычнай экономікі.

Няхай жыве рэволюцыйная барацьба рабоча-сялянскай моладзі Заходняй Беларусі і Польшчы пад кіраўніцтвам компартыі і комсамолу!

Далоў белы тэрор польскіх фашыстых!

Будзем напагатове, каб да рашучы адпор інтэрвэнтам!

МАЦНЕЙ УДАР ПА ВОРАГУ!
Выкрываць і бязьлітасна біць чудзіншчыну, упарта і пасьлядоўна ажыцьцяўляць беларусізацыю

Выяўляць Чудзінаў, ачышчаць рады асьветнікаў ад варожых элемэнтаў
(З пастановы прэзыдыуму ЦП саюзу працасьветы)

Зьмешчаная ў артыкуле „Зьвязды“ ад 16-4—заява настаўніка Жыткавіцкага раёну Чудзіна з усёй яскравасьцю паказвае ліхаманкавае супраціўленьне вялікадзяржаўных шовіністых ажыцьцяўленьню ленінскай нацыянальнай політыкі.

Чудзін, перапяваючы тэорыю вялікадзяржаўных шовіністых, робіць паклёп на нацыянальную політыку, якая праводзіцца партыяй, імкнецца давесьці, што беларусізацыя праводзіцца „исскуственно“, пад прымусам, што „белорусский язык не жизненный“, „на нем никто не говорит“.

Чудзін і да яго надобныя не жадаюць бачыць вялізарнейшых посьпехаў будаўніцтва культуры, соцыялістычнай па зьместу і нацыянальнай па форме, якія дасягнуты працоўнымі масамі Савецкай Беларусі пасьля Кастрычніцкай рэволюцыі, дзякуючы правільнаму ажыцьцяўленьню ленінскай нацыянальнай політыкі.

Клясавы вораг, вялікадзяржаўны шовініст Чудзін, выступаючы супроць нацполітыкі партыі і ўраду, прапануе „все школы как национальные, так и белорусские постепенно русифицировать“,—г. зн. перайсьці да політыкі царызму ў нацыянальным пытаньні, стаць на рэйкі колёнізацыі Беларусі.

Вылазка вялікадзяржаўнага шовіністага Чудзіна сьведчыць аб тым, што ў радох асьветнікаў маюцца яшчэ Чудзіны, якія да гэтага часу ня выявілі свой клясава-варожы твар і ў скрытай форме імкнуцца перашкодзіць пасьпяховаму соцыялістычнаму будаўніцтву.

Прэзыдыум цэнтральнага праўленьня саюзу працасьветы прапануе ўсім саюзным організацыям шырока абгаварыць пытаньне аб контррэволюцыйнай вылазцы Чудзіна на сходах асьветнікаў, узьняць усю асьветніцкую масу на барацьбу з вялікадзяржаўным шовінізмам, як галоўнай небясьпекай, на конкрэтных справах выяўляць конкрэтных носьбітаў вялікадзяржаўнага шовінізму, адначасова не паслабляць барацьбы з беларускім контррэволюцыйным нацыянал-дэмократызмам і шовінізмамі ўсіх колераў.

Чудзіна, як клясава-варожы элемэнт, з радоў саюзу выключыць.

Саюзныя організацыі павінны яшчэ з большай настойлівасьцю весьці барацьбу з усімі вылазкамі клясава-варожых элемэнтаў у радох саюзу, няўхільна праводзячы курс на самаачышчэньне сваіх радоў.

Патрэбен пералом
(Чэрвеньскі раён)

Правядзеньне месячніка праверкі стану беларусізацыі было цесна ўвязана з вывучэньнем і популярызацыяй пастаноў Кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б па пытаньнях нацполітыкі. Аднак, рад партыйных і комсамольскіх ячэек да популярызацыі гэтых пастаноў адносяцца формальна.

Месячнік беларусізацыі спрыяў разгортваньню масавай растлумачальнай работы сярод рабочых, колгасьнікаў і бядняцка серадняцкіх мас вёскі па пытаньнях ленінскай нацполітыкі. І ўсё-ж такі, вынікі месячніка сьведчаць аб нездавальняючым становішчы з беларусізацыяй апарату ў Чэрвеньскім раёне і недапушчальна дрэнным становішчы з абслугоўваньнем нацменшасьцяй на іх роднай мове.

Возьмем, напрыклад, райвыканком і яго аддзелы. Пры праверцы выявілася, што частка працаўнікоў зусім не разумее задач нацполітыкі партыі. Справы не ва ўсіх аддзелах вядуцца на беларускай мове. Апараты Леспрамгаса, дарожнага будаўніцтва, якія маюць блізкую сувязь з насельніцтвам, зусім не беларусізаваны. У аддзелах райфо, канкому супрацоўнікі надзвычайна дрэнна ведаюць беларускую мову. Пры размовах звычайна ўжываецца расійская мова. З боку прэзыдыуму РВК і партыйна-комсамольскіх організацый не было сталай праверкі абслугоўваньня насельніцтва на беларускай мове.

Адсутнічае і настойлівасць у правядзеньні дырэктыў партыі аб беларусізацыі апарату. Надзвычайна дрэнна беларусізаваны апарат пошты і тэлеграфу. Большасьць работнікаў няпісьменны ў беларускай мове. Тэлефоністкі ніколі не адказваюць абанэнтам на беларускай мове, калі ім зададзеш пытаньне на беларускай мове. Яны заўжды просяць, каб ім гаварылі па-расійску. Расійская мова ўжываецца на пошце ўсюды. Белмову ведаюць адзін-два асобы.

Сваей ролі партыйная і комсамольская ячэйкі і профорганізацыі ў справе ажыцьцяўленьня беларусізацыі апарату і прыстасаваньня яго да абслугоўваньня нацменшасьцяй зусім ня ведаюць.

У ЦРК толькі паперкі пішуць па-беларуску, а гутараць усе з наведвальнікамі і паміж сабой на расійскай мове. Адказныя працаўнікі таксама ня ведаюць беларускай мовы. Тое-ж самае назіраецца і ў канторы Шосбуду. Там ёсьць праявы вялікадзяржаўнага шовінізму, антысэмітызму. Гэта сьведчыць аб тым, што кіраўніцтва Шосбуду ігнаруе дырэктывы партыі аб беларусізацыі, што ў Шосбудзе не мобілізаваны масы на барацьбу ўпартую за ажыцьцяўленьне нацполітыкі партыі.

Да гэтага часу няма пералому ў ажыцьцяўленьні беларусізацыі і на прадпрыемствах Чэрвеньшчыны.

Бібліятэка, якая маецца ў Чэрвені, засьмечана нацдэмаўскай літаратурай. У тым-жа нездавальняючым стане і бібліятэка беларускай сямігодкі.

Пададдзеныя факты сьведчаць аб тым, што ні партыйная, ні комсамольскія ячэйкі, установы і прадпрыемствы Чэрвеньшчыны, ні профсаюзныя організацыі не накіравалі сваёй увагі на выкананьне дырэктыў партыі ў пытаньнях нацполітыкі, не мобілізавалі працоўныя масы на ўпартае і пасьлядоўнае ажыцьцяўленьне беларусізацыі. Вузкі нездавальняючага праведзенага месячніка беларусізацыі павінны быць вывучаны і пазьбегнуты ў далейшай рабоце па ажыцьцяўленьню ленінскай нацполітыкі партыі.

М. Р.

Падпявале Чудзіна даць адпор!

У справе ажыцьцяўленьня беларусізацыі комсамольская організацыя м. Старасельле бязьдзейнічае. Ніякай работы па вывучэньню і ажыцьцяўленьню задач нацполітыкі сярод комсамольцаў і беспартыйнай працоўнай моладзі не вядзецца. А ў гэты самы час разьюшаныя вялікадзяржаўныя шовіністыя імкнуцца атакаваць генэральную лінію партыі ў пытаньнях нацполітыкі. Вучаніца 7-й клясы Старасельскай школы, „комсамолка“ Шчэрба Вераж выступае з агіднай прапановай пакрыўджанага русапяпа.

—Даеш у 5-ці дзёнку некалькі дзён гаварыць выключна па-расійску!

Гэтая шовіністка спрабуе дамагчыся таго, каб ёй вызначылі пэўныя дні, калі-б яна магла распаясвацца ў сваёй шкодніцкай русапяпскай дзейнасьці. Гэтая разбешчаная шовіністка, пралезшая нейкім чынам у рады комсамолу, узьнімае свой голас протэсту супроць ленінскай нацполітыкі партыі, супроць настойлівага ажыцьцяўленьня беларусізацыі. Комсамольская ячэйка не рэагавала на вылазку гэтага носьбіта варожай ідэолёгіі.

Патрэбна неадкладна мобілізаваць масы комсамольцаў і беспартыйнай працоўнай моладзі на бязьлітасную барацьбу з праявамі вялікадзяржаўнага шовінізму, як найбольш небясьпечанага ў дадзены пэрыод, беларускага нацыянал-дэмократызму і шовінізмаў іншых колераў. Комсамольская ячэйка павінна шырока разгарнуць растлумачальную работу ў пытаньнях нацполітыкі партыі.

Падпявалам Чудзіна няма месца ў комсамоле!

Ударнік „Ч.З.“ Дрозд

Такім ня месца сярод нас

Прачытаўшы артыкул у „Зьвяздзе“ ад 16-IУ „Чудзіншчыну вырваць з карэньнямі“, студэнцкі колектыў Менскага яўрэйскага пэдтэхнікуму абураны контррэволюцыйным выступленьнем былога студэнта нашага тэхнікуму—Чудзіна. Мы кваліфікуем яго выступленьне як нахабную спробу клясавага ворага атакаваць генэральную лінію партыі ў нацпытаньні.

Яшчэ ў мінулым годзе, будучы ў тэхнікме, Чудзін выступіў супроць вывучэньня беларускай мовы. Але, дзякуючы таму, што комсамольскі колектыў мобілізаваў вакол гэтага грамадзкую думку, ён прызнаў свае памылкі і абяцаў выправіць іх на практычнай рабоце. Паверыўшы яму, камісія па чыстцы ЛКСМ вынесла толькі суровую вымову.

Сёньняшняе выступленьне яго паказвае, што Чудзін—агідны двурушнік. Ён застаўся тым-жа разьюшаным вялікадзяржаўным шовіністым.

Чудзін сваім выступленьнем грае на руку беларускім нацыянал-дэмократам і шовіністым усіх колераў. Ён салідарызуецца з Рамзінымі, Кандрацьевымі і лье ваду на млын нацыянал-фашыстых Заходняй Беларусі—Астроўскіх, Луцкевічаў і К°.

Усё гэта паказвае, што Чудзін ня можа быць у радох чырвонасьцяжнага настаўніцтва, што нельга даручыць яму выхаваньня падрастаючага пакаленьня. Мы патрабуем выключэньня яго з радоў ЛКСМБ і саюзу працасьветы.

Мы абяцаем яшчэ з большай упартасьцю разгортваць беларусізацыю і ўзмацніць інтэрнацыянальнае выхаваньне.

Абвяшчаем месячнік па вывучэньню нацпытаньня і ўзмацненьню беларусізацыі.

Студэнцкі колектыў
Менскага Я. П. Т.

Правяраем выкананьне пастаноў зьездаў

АЎЛАДАЦЬ ВАЙСКОВАЙ ТЭХНІКАЙ,
пасіліць тэмпы вярбоўкі ў вайсковыя школы

НАЧНЫ ПАХОД

Усю ноч штаб комсамольскага ваенізаванага паходу ў Сураскім раёне не заплюшчваў вачэй, пачынаючы з 24 гадзіны, комсамольцы прыбывалі на зборныя пункты.

У штабе званіў тэлефон, бегалі пасыльныя, ладзіліся агітфурманкі, формаваліся роты.

І вось, а 6-й гадз. раніцы, пачалася на зборных пунктах вучоба комсамольскага батальёну. А 12-й гадз. роты выступілі ў паход.

„Чырвоныя“ наступалі на Сураж з Янавіч і Курына.

Прайшлі значную колькасьць кілёмэтраў, прытаміліся, але калі разьведка данесла, што „сінія“ заселі на акраінах Суражу,—наступаючая комсамолія зноў бадзёра рушылася, разгортваючыся ў баявым парадку.

„Праціўнік“ таксама ня спаў. Яго разьведка аблазіла ўсе хмызьнякі, ляскі і пералескі.

Пачалася „бойка“.

„Чырвоныя“ ішлі, ахапляючы „сінія“ часткі ламцугом і, нарэшце, рушыліся ў атаку.

Загрукацела „ура“. Замітусіліся і „сінія“ і „чырвоныя“... Праз нейкі час „свае“ з „праціўнікам“ зьбіраюцца ў калёны, падцягваючыся да г. Суражу.

Больш 400 комсамольцаў і асоавіяхэмаўцаў з оркестрам, стройна і ў парадку ўвашлі ў горад Сураж.

На пляцы кароценькі мітынг, а ўвечары ўсе сабраліся ў клюб на ўрачыстае паседжаньне. Абгаварвалі вынікі паходу.

На ўрачыстым сходзе комсамольцы адзначалі ня толькі посьпехі, але і недахопы, з якіх асноўныя: ня ўся комсамолія ўцягнута ў вайсковую вучобу, ня ўсе яшчэ аўладалі ваеннымі навыкамі.

. . . Разгарнуць вайсковую вучобу комсамолу, пашырыць рады Асоавіяхэму, ніводнага комсамольца па-за вайсковым навучаньнем, разгарнуць вярбоўку ў вайсковыя школы і падрыхтоўку да прызыву РСЧА нарадзіўшыхся ў 1909 годзе... Вось абавязкі, якія ўзяла на сябе Сураская комсамолія і ўдзельнікі вайсковага паходу на ўрачыстым сходзе.

Гэтыя абавязкі яны выканаюць.

Б. Блашэвіч.

За трэніроўкай процівагаза.

Койданава на праверцы

Зрыў вайсковай работы—вынік слабага кіраўніцтва РК

З ваенізацыяй не ва ўсіх ячэйках КСМ Койданоўскага раёну абстаіць добра. Толькі ў некаторых ячэйках, як то: комуны „Чырвоны Сьцяг“, „Татаршчына“. колгасу „Зьвязда“, саўгасу „Новасёлкі“, МТС, БКШН і Вільшчыны вайсковыя занятკі праводзяцца рэгулярна у вайсковыя гурткі. Організаваныя гэтымі ячэйкамі ўцягнута значная колькасьць беспартыйнай моладзі. Заняткі праходзяць як па вывучэньню рознага роду зброі, так і па тактыцы бою.

Астатнія ячэйкі ваенізацыяй займаюцца ад пары да пары.

Актыў гэтых ячэек і, ў першую чаргу, сэкратары, злосна ўхіляюцца ад наведваньня заняткаў у вайсковых гуртках.

У 12-ці вайсковых гуртках стала займаюцца толькі 430 чалавек з 800 комсамольцаў Койданаўскай організацыі.

Асоавіяхэмам комсамольцы ахоплены не 95 проц.

Вярбоўка лепшых комсамольцаў у вайсковыя школы праводзіцца дрэнна. Камандыравана толькі 6 комсамольцаў, з якіх адзін рабочы.

Прычынамі гэтага ганебнага становішча з ваенізацыяй комсамольскіх радоў і пасылкай лепшых комсамольцаў у вайсковыя школы зьяўляецца тое, што райком комсамолу ня досыць рашуча ставіў пытаньне перад зрыўшчыкамі вайсковых заняткаў і перад тымі, якія адносіліся да гэтае справы формальна.

Па-другое, што РК ЛКСМБ і ячэйкі праводзілі недастаткова масава-растлумачальную працу сярод комсамольцаў і беспартыйнай працоўнай моладзі аб вайсковай небясьпецы і неабходнасьці ваенізацыі.

Нават зdroва 9-га зьезду і маршруты „Комсамольскай Праўды“ ня былі даводзены да шырокіх мас комсамолу.

Мамарэвіч.

Месячнік баявой вясеньняй трывогі комсамолу

ДАГАВОР КАНТРАКТАЦЫІ ПАВІНЕН МЕЦЬ КОЖНЫ КОЛГАС, КОЖНЫ АДНААСОБНІК

За дні, якія засталіся да выхаду ў поле, кантрактацыя збожжавых і тэхнічных культур павінна быць скончана

СКОНЧЫЦЬ КАНТРАКТАЦЫЮ Ў ВЫЗНАЧАНЫ ПАРТЫЯЙ ТЭРМІН

З ПАСТАНОВЫ КОЛЕГІІ НК РСІ БССР АД 15-IV—1931 г.

Адзначыць, што пастанова СНК аб сканчэньні работы па кантрактацыі да 15 красавіка ня выканана. Цэнтральныя колгасна-коопэрацыйныя ўстановы (Малжывёлсаюз, Ільнасаюз, Садгародсаюз і Насеннаводсаюз) опортуністычна аднесьліся да правядзеньня работы па кантрактацыі, у выніку чаго забясьпечаньне раёнаў дагаварамі зацянулася да канца сакавіка месяца.

Адзначыць адсутнасьць масавай работы па складаньню дагавароў як у колгасах, так і сярод аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

5. Наркомзем і Наркомгандаль засталіся ў баку ад кіраўніцтва.

Кантрактацыя насеньня гатунковага аўса, караньплодаў, насеньня траў і асабліва кантрактацыя сена—стаіць пад пагрозай зрыву. Па сыстэме Насеннаводсаюзу з 32-х раёнаў—14 раёнаў да гэтага часу не разьмясьцілі кантрольных лічбаў (Хоцімскі, Мазырскі, Капаткевіцкі, Юравіцкі і інш. раёны. Ёсьць моманты скармліваньня высадкаў караньплодаў для жывёлы (Талочынскі раён).

Наяўнасьць усіх гэтых опортуністычных адносін да працы па правядзеньню кантрактацыі мае сваім вынікам ганебныя лічбы выкананьня пляна. На 1-IV закантрактавана збожжавых культур 18,3 проц., ільнавалакна—23,2 проц., пянькі—27,1 проц. бульбы—12,8 проц. і сена—3,0 проц.

Выходзячы з гэтага, Колегія НК РСІ пастанаўляе:

а) Катэгорычна прапанаваць сыстэмам сельска-гаспадарчай коопэрацыі (Малжывёлсаюзу, Насеннаводсаюзу, Садгародсаюзу і Ільнасаюзу), пад адказнасьць загадчыкаў установ, скончыць правядзеньне кантрактацыі ў канчаткова вызначаны тэрмін ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

б) Прапанаваць РВК і райкоопсаюзам выправіць наяўныя памылкі ў складаньні дагавароў у колгасах бяз удзелу колгасьнікаў, а таксама сярод аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, дзе пытаньне кантрактацыі ня было ў належным парадку падрыхтавана і дзе адозва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР, ЦК КП(б)Б і СНК БССР—не прапрацавана. Правядзеньне кантрактацыі павінна прайсьці пры абавязковым абгаварэньні адозвы.

в) Указаць Наркомзему і Наркомгандлю на невыстарчальнасьць кіраўніцтва работай па правядзеньню кантрактацыі і на маруднасьць рэагаваньня на опортуністычныя адносіны паасобных сыстэм сельска-гаспадарчай коопэрацыі, а таксама тых РВК і райкоопсаюзаў, якія бязьдзейнічалі у разгортваньні працы па кантрактацыі.

г) Прапанаваць (Наркомгандлю, Малжывёлсаюзу, Садгародсаюзу, Ільнасаюзу і Насеннаводсаюзу) скарыстаць працаўнікоў апарату для пасылкі ў раён.

д) За бязьдзейнасьць і адсутнасьць усякай работы па правядзеньні кантрактацыі, Жлобінскаму і Чавускаму старшыням райкоопсаюзаў абвясьціць вымову.

е) Катэгорычна прапанаваць Белільназаюзу, пад адказнасьць тав. Лапіса, не пазьней 3-хдзённага тэрміну—даць указаньне раёнам аб кантрактацыі лёну на трасту.

ж) Прапанаваць Наркомзему і Наркомгандлю выявіць тыя раёны, якія не разьмеркавалі кантрольных лічбаў п кантрактацыі і прыцягнуць да адказнасьці.

з) Указаць Талочынскаму РВК і райкоопсаюзу на недапушчальныя зьявішчы скармліваньня колг самі высадкаў караньплодаў для жывёлы.

Прапанаваць РКК-РСІ ўстанавіць сыстэматычны кантроль за ходам кантрактацыі і своечасова рэагаваць на марудны ход складаньня дагавароў.

Нарком РСІ Беларусі Калнін.

К бою гатовы.

Па-ўдарнаму рыхтуецца да сяўбы

Да абвешчанага комсамолам месячніку пасеўнай трывогі у падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы Заслаўская МТС мела прарыў.

Трактары і машыны ня былі поўнасьцю сабраны і адрамантаваны, але за 10 дней ўдарнай бальшавіцкай работы, соцспаборніцтва паміж брыгадамі прарыў быў ліквідаваны.

25-III ня гледзячы на дрэннае надвор'е, адбыўся першы пробны выезд ў поле. 22 трактары МТС у поўнай спраўнасьці з прычэпным інвэнтаром са сьцягамі дэманстравалі сваю баявую гатоўнасьць да сяўбы.

МТС разаслаў па асобных колгасах, дзе будуць працаваць трактарныя калёны, 52 тоны гаручага. Запасу хопіць на мясяц работы.

33 трактары з 41 поўнасьцю адрамантаваны з прычэпнымі машынамі.

Ёсьць і недахопы. Ня ўсе трактарыстыя, якія скончылі месячныя курсы, атрымалі поўную кваліфікацыю, што будзе перашкодай у нормальнай рабоце МТС.

Комсамольская і піонэрская організацыі ўсямерна дапамагаюць МТС рыхтавацца да другой бальшавіцкай вясны.

Брыгада: Авер і Зялёны.

Рэалізуем прапанову „Чырвонкі“

По трох колгасах ліквідавана абязьлічка, дзесяць колгасаў пераведзены на зьдзельшчыну з улікам у працаднёх

Абвешчаны ЦК ЛКСМБ месячнік баявой вясеньняй трывогі праводзіцца ў Баркавіцкім раёне ўдарным парадкам. У аснову месячніка пакладзена самаправерка комсамольскай організацыі: які ўдзел прымае яна ў колектывізацыі і ў правядзеньні вясеньняй пасеўнай кампаніі. Адна ачэйка правярае другую, пасылаючы спэцыяльныя праверачныя і буксірныя брыгады. Усяго ўдзельнічае ў брыгадах самаправеркі 130 комсамольцаў.

Атрады лёгкай кавалерыі праверылі Райколгассаюз і Райкоопсаюз. На складах Райкоопу выяўлена вялікая колькасьць нерэалізаваных с.-гаспадарчых машын і шмат угнаеньня. Матар'ял праверкі накіраваны для рэагаваньня ў РайКК-РСІ.

Галоўную ўвагу ў падрыхтоўцы да пасеўкампаніі комсамольская організацыя ўдзяляе барацьбе за тэмпы колектывізацыі, за новы прыліў. Ёсьць ужо вялікія дасягненьні. Зараз раён колектывізаваны на 36 проц. Некаторыя сельсаветы падыходзяць да ажыцьцяўленьня суцэльнае колектывізацыі. Так, Замшанскі сельсавет колектывізаваў 60 проц, Кушнікоўскі—47 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Сіламі комсамольскіх ячэак організаваны 4 колгасы з 80 гаспадарак і адно таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі.

По ініцыятыве комсамолу, 12-га красавіка быў організаваны ўсераённы пробны выезд колгасаў у поле, які прайшоў з вялікім уздымам. На пробных выездах прысутнічала шмат аднаасобнікаў, якія разам з колгасьнікамі дэмонстравалі сваю падрыхтаванасьць да сяўбы.

Пяць колгасаў, што ўдзельнічала ў пробным выезьдзе, прынялі ў гэты дзень больш 30 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Зараз комсамольская організацыя пераключылася на організацыю працы ў колгасах. Праводзіцца растлумачэньне і популярызацыя пастаноў VI-га зьезду саветаў. 10 колгасаў ужо перайшлі поўнасьцю на зьдзельшчыну з улікам у працаднёх, 25 часткова. Комсамольская організацыя падхапіла ініцыятыву „Чырвонай Зьмены“ ліквідаваць абязьлічку ў колгасах і саўгасах. Гэта пытаньне распрацавана на Бюро Райкому і на агульным раённым комсамольскім сходзе. У многіх колгасах („Сталіна“, „Ільліч“, „Ульянава“) абязьлічка ўжо ліквідавана.

Месячнік баявой трывогі мобілізаваў актыўнасьць і энэргію комсамольскай організацыі на ліквідацыю прарываў для пасьпяховага правядзеньня другой бальшавіцкай сяўбы.

Сэкратар Баркавіцкага Райкому ЛКСМБ **А. Быхаўскі.**

Далі сустрэчны на кантрактацыю

У Грэскім раёне за апошні час, дзякуючы ўдарнаму правядзеньню месячніка баявой вясеньняй трывогі, падрыхтоўка да вясеньняй сяўбы праходзіць здавальняюча.

Ёсьць вялікія дасягненьні ў правядзеньні колектывізацыі. У Палікараўскім сельсавеце колектывізавана бядняцка-серадняцкіх гаспадарак 60 проц. Колгасы распрацаваўшы адозву ЦК і СНК аб кантрактацыі яравых пасеваў, поўнасьцю выканалі пляны. Закантрактавана 70 га тэхнічных культур.

Колгасы „Чырвоная Ніва“ і „Варашылава“, высунуўшы сустрэчныя пляны, закантрактавалі на некалькі га больш раённага пляну.

Колгасамі закантрактавана малака 3616 цэнтнэраў і аднаасобным сэктарам 160 цэнт. Кулацка-заможным гаспадаркам дадзена цьвёрдае заданьне па пасеву яравых і выкананьню плянаў загатоўкі малака.

Комсамольская ячэйка па-ўдарнаму рыхтуецца сустрэць другую бальшавіцкую вясну.

Якка Дымаў.

Да пятага мая скончыць кантрактацыю тэхнічных культур

КОЙДАНАВА. 17. (Па тэлефону) У выніку ўпартай барацьбы з кулакамі і опортуністымі, партыйна-комсамольская організацыя Койданаўскага раёну дасягнула вялікіх посьпехаў у кантрактацыі.

На 10-IV-г. г. плян кантрактацыі ўсіх відаў збожжавых культур па колгасным і аднаасобным сэктары выканан на 131,4 проц, а тэхнічных—на 71 проц. пляну.

Кантрактацыя шчыльна ўвязваецца з правядзеньнем колектывізацыі. За месячнік баявой комсамольскай трывогі раён павысіў колектывізацыю з 34 проц. да 40 проц.



Пробны выезд у поле

Комсамольская організацыя мобілізавана на актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да сяўбы. 25 чалавек комсамольскага актыву накіраваны для правядзеньня працы па кантрактацыі.

У ячэйках складзены брыгады для правядзеньня і аформіленьня ўмоў па кантрактацыі.

Г. Юдзянкоў.

Організавалі колгасна вытворчую эстафэту

Каб лепш правесьці бальшавіцка-колгасную вясну, комсамольская ячэйка школы-комуны імя Калініна, г. Віцебск, склала соцыялістычную ўмову з падшэфным колгасам. Для выкананьня гэтай умовы ячэйка організавала колгасна-вытворчую эстафэту з асоба распрацаванымі маршрутамі.

Эстафэта ўжо разгарнулася ва ўсю шырыню. Па асобных маршрутах створаны ўдарныя вядзёркі з комсамольцаў і вучняў школы. Адна брыгада, сумесна з актывам сельсавету, давяла плян пасеўкампаніі да вёсак і паасобных гасп., а другая праводзіць работу па колектывізацыі і кантрактацыі яравых.

Вучні школы адсартавалі 9 тон аўса, сабралі мэталялом, каб адрамантаваць інвэнтар у колгаснай кузьні. Ідзе падрыхтоўка да ачысткі 5-га саду і пасадкі 10 га. новага саду.

Небасёў

Ні адзін колгас не пераведзен на зьдзельшчыну

Хутарскі сельсавет, (Чэрвеньскі раён) мае пяць колгасаў. Рыхтуючыся да 2-й бальшавіцкай сяўбы, яны зварочваюць галоўную ўвагу на ачыстку насеньня, рамонт інвэнтара, засыпку насенных і страхавых фондаў, але зусім забыліся аб адной з важнейшых задач, пастаўленых VI зьездам саветаў: аб правільнай організацыі працы ў колгасах, аб пераводзе на зьдзельшчыну з улікам працадзён.

Нівдзін колгас ня склаў яшчэ брыгад па паасобных галінах работы.

Трэба зараз-жа безадкладна разгарнуць масава-палітычную работу навакол рашэньня VI зьезду саветаў як у колгасах, так і ў аднаасобным сэктары, да выхаду ў поле перавесьці работу колгасаў на зьдзельшчыну, з падлікам працадзён і ліквідаваць абязьлічку, што дасьць магчымасьць хутчэй і лепш правесьці бальшавіцкі сеў.

М. Р.

Пад суд зрыўшчыкаў кантрактацыі

Ў Чаршунскім сельсавеце кантрактацыя яравых культур сарвана. У вёсках Горы. Курганы і Бахнетаўцы 55 гаспадарак закантрактавалі ўсяго 20 га аўса і 3 га ячменю.

Сельсавет гэтай працай ня кіруе. Не вядзецца праца сярод аднаасобнікаў беднякоў і серадьнякоў, што спрыяла зрыву правядзеньня кантрактацыі.

Шуляк

Ганебна адсталі

Кантрактацыя яравых у Лельчыцкім раёне значна адстала. Плян выканан толькі на 30 проц. Масавая работа сярод колгасьнікаў і аднаасобнікаў разгорнута слаба. Адозва ЦК і СНК аб кантрактацыі не популярызуецца.

Асабліва опортуністычны самацёк пануе ў Райкоопсаюзе і Райколгассаюзе. Па колгасах кантрактацыя праведзена толькі на 2 проц.

З прыездам спэцыялізаванай брыгады „Чырвонай Зьмены“, Райкамол мобілізаваў увесь комсамольскі колектыў на выкананьне пляну кантрактацыі.

С. Гаввы

Узяць яшчэ вышэйшыя тэмпы

БРАГІНА, 18. (Па тэлеграфу).—15-е красавіка ў Брагінскім раёне закантрактавана па колгасным сэктары: збожжавых культур—82 проц., тэхнічных—81 проц. да пляну. Аднаасобнікамі: збожжа—67 проц. і тэхнічных культур—64 проц. Выканалі поўнасьцю плян кантрактацыі 10 сельсаветаў, перавыканалі 3 сельсаветы.

Прымаюцца ўсе захады скончыць кантрактацыю да 20-га красавіка.

Райкамол

Узялі тэмпы

ЛЁЗНА.—Раён па-баявому ўключыўся у месячнік вясеньняй трывогі комсамолу для сустрэчы і пасьпяховага правядзеньня другой бальшавіцкай вясны.

Райкамол правёў куставыя сходы комсамолу. 25 комсамольцаў з раённага актыву накіраваны ў сельсавет для непасрэднай дапамогі колгасам, ячэйкам і сельсаветам у правядзеньні падрыхтоўкі да сяўбы.

На ліквідацыю прарываў у падрыхтоўцы да сяўбы мобілізаваны ўвесь партыйны, комсамольскі і профсаюзны актыў раёну. 15-га красавіка на ўсім раёне праведзены пробныя выезды ў поле.

К.

Крычаўцы ў авангардзе

КРЫЧАЎ. 18 (Па тэлеграфу). Па-ўдарнаму разгарнулі правядзеньне месячніка баявой вясеньняй трывогі комсамолу. Плян кантрактацыі яравых выкананы па раёне на 136 проц.

Правядзеньне кантрактацыі цесна ўвязваецца з колектывізацыяй. У вёсцы Ратная комсамольскай брыгадай пры правядзеньні сходу па кантрактацыі організаваны колгас.

Фонкац.

Да другой гадавіны соцспаборніцтва

У першых радох соцыялістычнага будаўніцтва

Выканаць прамфінплян—гэта значыць, выканаць яго колькасныя і якасныя паказчыкі.

Ударная брыгада кавалёў, кавальнага цэху заводу „Камунар“—адна з тых, якая здолела ўдарнай працай выканаць колькасныя і якасныя паказчыкі пляну.

Ударная брыгада цалкам выканала прамфінплян ударнага кварталу. Якасьць добрая.

На здымку: ударная брыгада Кавалёў заводу „Камунар“. Справа сядзіць брыгадзір Ціханаў.

Вынікі расьсьледваньня Сьмілавіцкай справы

Пастанова Сэкратарыяту ЦК і Прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б ад 1-2—IУ-31 г.

1. Адзначыць, што цэнтральны друк правільна сыгналізаваў аб фактах заціску самакрытыкі і ганеньня супроць корэспандэнтаў у Дукорах. У рабоце дукорскіх партыйных ячэяк (саўгаскай і сальсавецкай) мелі месца грубыя права-опортуністычныя скажэньні і заціск самакрытыкі, што выявілася ў ігнараваньні пастаноў партыі па рабоце з беднатой, у яўным змыканьні і патураньні кулаку з боку раду партыйцаў і засьмечанасьць колгасаў кулацка заможнымі элемэнтамі. Партячэйкі не змагаліся з нацдэмаўскім выкладаньнем літаратуры, антысэмітызмам, вялікадзяржаўным шовінізмам і інш. хваравітымі зьявамі ў школе колгаснай моладзі. Ячэйкі дапусьцілі „левыя“ загібы ў рабоце, спробы колектывізаваць вёску Харавічы мэтадам давядзеньня цьвёрдых заданьняў да бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак.

2. Дукорская справа выявіла адсутнасьць разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі і слабую мобілізаванасьць Сьмілавіцкай партыйнай організацыі на барацьбу з правым і „левым“ опортунізмам і прымірэнцтвам да ўхілаў ад генеральнай лініі партыі. У практычнай дзейнасьці раду ячэек і зьвеньняў організацыі маюць месца:

а) у выніку слабага наступленьня на кулацкія элемэнты і невыкананьня дырэктыў партыі аб сыстэматычнай рабоце з беднатой—права-опортуністычны самацёк і недапушчальнае адставаньне ў колектывізацыі (за год рост колектывізацыі на 3 проц).;

б) засьмечанасьць колгасаў кулацкімі, заможнымі элемэнтамі і „былымі людзьмі“;

в) недастатковае выкананьне раду важнейшых загатовак (лён, мобілізацыя сродкаў, кантрактацыя, камні) і слабая падрыхтоўка да веснавой пасеўкампаніі.

Сэкратарыят ЦК і Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б адзначаюць, што РК і РКК слаба змагаліся з опортуністычнымі скажэньнямі партыйнай лініі і праявілі ў паасобных выпадках прытупленьне клясавай чуласьці і няўменьне разабрацца ў абставінах абвостранай клясавай барацьбы.

3. Утвораная райпрокурорам т. Піонавым, з ведама РК і РКК, паказальная судовая справа над членамі партыі—старшынёю прымястэчковага колгасу „Профінтэрн“ т. Лазарчуком, з прад'яўленьнем яму абвінавачваньня ў злачыннай безгаспадарнасьці, якая мяжуецца з шкодніцтвам, замест аддаць пад суд непасрэдных вінавайцаў, чужы элемэнт, якія вялі разлагаючую работу ў колгасе—зьяўляецца праяўленьнем грубага адміністраваньня і „лёвых“ загібаў у рабоце суда і пракуратуры, якія цесна пераплятаюцца з права-опортуністычнай практыкай у Сьмілавіцкім раёне. Політычную блізарукасьць, праяўленую Бюро РК, Прэзыдыумам РКК і райпракурорам у справе Лазарчука—скарысталі клясава варожыя элемэнты ў барацьбе супроць колектывізацыі.

Сэкратарыят ЦК і Прэзыдыум ЦКК рашуча асуджаюць анты-партыйны ўчынак Лазарчука, як рэагаваньне на рашэньне суда замахам на самагубства. Лічыць зусім недапушчальным, што РК і РКК марудзілі ў сваім рэагаваньні на гэтую справу, ня гледзячы на політычнае значэньне яе, што клясава-варожыя элемэнты скарысталі ў організацыі колгаснай масы супроць пастановы суда.

На падставе гэтага, Сэкратарыят ЦК і Прэзыдыум ЦКК пастанаўляюць:

1. Прыняць да ведама паведамленьне камісіі, што РК і РКК прыняты пастановы па гэтых справах аб мобілізацыі партыйнай організацыі на разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі і правядзецьне генэральнай лініі партыі.

2. Прапанаваць Сьмілавіцкаму РК і РКК правесьці неадкладную работу па растлумачэньню партыйнай організацыі, рабочым, колгасным, батрацка-бядняцкім і серадняцкім масам сутнасьці гэтых спраў і прынятых па ім рашэньняў, мобілізуючы іх пад кіраўніцтвам парторганізацыі на рашучае змаганьне з кулаком, зламаўшы яго супраціўленьне, на ачыстку колгасаў ад кулацка-заможных і чужых элемэнтаў, організацыі новага прыліву ў колгасах. Паставіць у асяродку ўвагі задачу мобілізацыі ўсіх зьвеньняў раёну на правядзеньне веснавога севу, на поўную ліквідацыю прарываў у гаспадарча-політычных кампаніях.

3. РК і РКК забясьпечыць мобілізацыю партыйнай і комсамольскай організацыі на правядзеньне ўсіх пастаўленых партыяй задач, рашуча пасіліўшы барацьбу з правым опортунізмам—галоўнай небясьпекай, „левымі“ загібамі і прымірэнцтвам да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі, узмацніць барацьбу з усялякімі скажэньнямі нацполітыкі партыі, асабліва з вялікадзяржаўным шовінізмам, як найбольш небясьпечным, з нацыянал-дэмократызмам, антысэмітызмам і інш. шовінізмамі, забясьпечыць пасіленьне тэмпаў беларусізацыі і ачыстку культурна-асьветных і навучальных устаноў ад чужых элемэнтаў.

4. Прапанаваць РК і РКК пасіліць партыйнае кіраўніцтва і кантроль за правядзеньнем выразнай клясавай лініі ў рабоце суда і пракуратуры, ні ў якім выпадку не дапускаючы падмены сабою і апекі над іх работай, забясьпечыўшы ў іх рабоце пасіленьне барацьбы з кулаком і чужым элемэнтам.

5. Указаць рэд. газ. „Чырвоная Зьмена“ на допушчаную грубую політычную памылку ў беспадстаўнай компромэнтацыі і разаблачэньні юнкора Лявіцкага, чым об'ектыўна газэта стала на шлях заціску самакрытыкі. Лічачы недапушчальным, што рэдакцыя газ. „Чырвоная Зьмена“ пасьля правільнай крытыкі памылак „Чырвонай Зьмены“ з боку ЦО КП(б)Б „Зьвязда“—не асудзіла сваіх памылак, прапанаваць рэдакцыі асудзіць праз друк свае памылкі, пасіліўшы організатарскую выхаваўчую работу з юнкорамі.

6. Улічваючы, што сэкратар Сьмілавіцкага РК КП(б)Б т. Стром, старшыня РКК т. Росьлік—дапусьцілі грубую опортуністычную памылку ў справе Лазарчука і прымірэнчыя адносіны да опортунізму—зьняць з працы т. т. Строма і Росьліка.

7. Пастанову апублікаваць у друку.

Сэкратар ЦК КП(б)Б **Гей.**

Старшыня ЦКК КП(б)Б **Калнін.**

Друкарня імя тав. Сталіна

НОВАЙ ХВАЛЯЙ ВЫТВОРЧАГА УЗДЫМУ СУСТРЭНЕМ ЮБІЛЕЙ „ЧЗ“

Комсамольская Зарэчынская ячэйка, у адзнаку юбілею штурмуе недахопы працы колгасу, паказваючы ўзоры прыкладнай працы

Уся комсамольская ячэйка

ударная брыгада імя „ЧырвонайЗьмены“

25 комсамольцаў Зарэчынскай колгаснай ячэйкі (Горацкі раён), у адзнаку 10-ці гадовага юбілею „ЧЗ“ організаваліся ва ўдарную комсамольскую брыгаду па ліквідацыю прарываў у працы колгасу.

Брыгада ставіць перад сабою асноўныя задачы змагацца за лепшае правядзеньне другой бальшавіцкай вясны, канчатковы пераход колгасу на зьдзельшчыну, за разгортваньне соцспаборніцтва і ўдарніцтва ў колгасе і за падняцьце вытворчасьці працы.

Брыгада замацавалася да канца пяцігодкі ў колгасе.

У выніку працы ўдарнай „Чырвоназьменаўскай“, колгас канчаткова перайшоў на зьдзельшчыну. Ачышчана насеньне, адрамантаваны ўвесь інвэнтар і падрыхтаваны да пробнага выезду ў поле.

У першых радох ударнай брыгады ідуць:—Маўчанкоў, які адпрацаваў у колгасе больш за ўсіх (172 дні) і кожны дзень яго працы раўняўся працы трох колгасьнікаў, Маўчанкоў кожны дзень едзе ў лес адзін на трох падводах Кузьняцоў Саша-сэкратар колгасу, добраахвотна згадзіўся працаваць адначасова сэкратаром і рахункаводам. Комсамолец Саша спраўляецца з гэтай працай цалкам.

А. Літок.

10 год змаганьня і нястомнай барацьбы за генэральную лінію партыі.

25-га красавіка ўвесь комсамол Беларусі сьвяткуе 10-цігодзьдзе „Чырвонкі“.

Ад „Красного факела“ і „Красной Смены“ да „Чырвонай Зьмены“ такі шлях барацьбы і росту газэты.

Палякі абстрэльваюць Беларусь—„Чырвонка“ кліча на фронт.

Брюкі-клёш фасонные,
Бескозыркі тонные—

пяюць комсамольцы, ідучы праз лясы. А у руках „Чырвонка“. Сьціхлі стрэлы. „Чырвонка“ кліча на другі фронт—браць гаспадарчы перакоп. Дзесяць год дзень у дзень б'ецца комсамолец—„Чырвонка“ за гэнэральную лінію партыі,

Наша палкае прывітаньне юбіляру. За 60-тысячны тыраж „Чырвонай зьмены“—наш лёзунг дня.

Прэзыдыум сходу „Будвучу“.

Ускладзеныя задачы—выканаем

ЦК ЛКСМБ і „Чырвонай Зьмене“

ЦК ЛКСМБ і рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“ ад першай конфэрэнцыі рабочае моладзі Бабруйскага дрэваапрацоўчага комбінату—палкае прывітаньне.

Наша конфэрэнцыя сабралася для таго, каб падвесьці вынікі працы комбінату за першы квартал трэцяга, рашаючага году пяцігодкі, падагуліць удзел рабочай моладзі ў выкананьні прамфінпляну і разгортваньні соцыялістычнага спаборніцтва.

Наша конфэрэнцыя абгаварыла і намеціла конкрэтныя мерапрыемствы па ажыцьцяўленьню высунутага тав. Сталіным лёзунгу аб аўладаньні тэхнікай і рашэньняў 9-га зьезду Усе ЛКСМ аб пeратварэньні ЛКСМ у шматмільённую організацыю.

Конфэрэнцыя абвяшчае сябе ўдарнай на выкананьне прамфінпляну другога квартала і ажыцьцяўленьне рашэньняў комсамольскіх зьездаў.

Конфэрэнцыя запэўнівае ЦК ЛКСМБ і рэдакцыю „Чырвонай Зьмены“, што рабочая моладзь комбінату, пад правільным кіраўніцтвам комуністычнае партыі і ЦК ЛКСМБ, будзе надалей стаяць у першых радох барацьбітоў за выкананьне грандыёзных задач па ажыцьцяўленьню генэральнай лініі партыі.

Замест падрыхтоўкі—гульня ў карты

Падыходзіць юбілей „Чырвонай Зьмены“. Некаторыя ячэйкі прыходзяць да юбілею з ганебным прарывам. Прыкладам: комсамольская ячэйка колгасу „Чырвоны Маяк“ (Случчына) не разгарнула падрыхтоўчай работы да юбілею.

У ячэйцы 10 комсамольцаў і ніхто з іх ня выпісвае „Чырвоную Зьмену“, у тым ліку і сам сэкратар ячэйкі. Сярод вясковай моладзі газэта не распаўсюджваецца. Сэкратар ячэйкі, тав. Малы, гаворыць; „Няма калі займацца юбілеем, калі ёсьць больш важныя справы“.

Комсамольцы ячэйкі „Чырвоны Маяк“ ня выпісваюць „Ч. З.“ прычыны опортуністычнай бяздзейнасьці сэкратара. Культвыхаваўчая праца на вёсцы не падзецца. Колгасная і вясковая моладзь у сьвяточныя вечары, замест пачытаць газэту, гуляе ў карты. Не адстаюць і комсамольцы (Ляткоўскі і іншыя).

Ці не пара Райкому ЛКСМБ праверыць становішча ячэйкі?

Комсамолец

Пастанавілі і... забыліся

У паасобных комсамольскіх ячэйках Халопеніцкага раёну комсамольцы ня чытаюць сваёй газэты „Чырвоная Зьмена“. На паседжаньні бюро РК была вынесена пастанова аб тым, што кожны комсамолец павінен выпісваць „Чырвоную Зьмену і, акрамя таго, завербаваць ня менш 3 падпісчыкаў з беспартыйнай моладзі.

Гэтую пастанову бюро РК паасобныя комсамольскія ячэйкі ў жыцьцё не праводзяць. Траяноўская, Шашская, Узвацкая ячэйкі і рад іншых зусім ня выпісваюць „Ч. З“. Заданьне па выпісцы на першы квартал ня выканана на 90 экз. Яшчэ горш справа з выпіскай на красавік месяц,—замест 300 экз. па заданьню, выпісана ўсяго 158 экз.

Скліканая нарада ўпаўнаважаных комсамольскіх ячэек па друку на 6-III—г. г. сарвалася, бо ўпаўнаважаных у ячэйках няма.

Халопініцкая ВШСМ выпісвае 32 экз. „Ч. З“, ня гледзячы на тое, што там займаецца шмат моладзі.

Халопеніцкаму РК ЛКСМБ неабходна зараз-жа праверыць як праводзіцца ў жыцьцё пастанова ЦК ЛКСМБ аб давядзеньні тыражу „Ч. З.“ да 60 тысяч экз.

Халопеніцкі.

Ня час сьмяяцца, трэба працаваць

Да юбілею „Ч. З.“ засталіся лічаныя дні. Але ячэйка „Будвучу“ БЖС ні разу не паставіла аб гэтым пытаньня, абмежаваўшыся правядзеньнем 10-ці хвіліннага сходу, на якім 20 чалавек уступіла ў рады КСМ. Калі адзін член бюро цьвёрда паставіў пытаньне аб узмацненьні падрыхтоўчай работы да юбілею, дык сэкратар, тав. Абрамовіч, насьмяялася. Па яе прапанове, бюро даручыла аднаму сябру правесьці справу з юбілеем. Вывад такі, што бюро жадае адчапіцца ад гэтага пытаньня. Гаркому КСМ патрэбна зараз-жа праверыць ход падрыхтоўкі ў гэтай ячэйцы, а таксама стан падрыхтоўкі ва ўсёй гар. організацыі КСМ.

А. Леў.

„Рэспубліка павінна быць комуністычнай“

ЛЁНДАН, 17—Паведамленьні з Гішпаніі сьведчаць аб росьце рэволюцыйнай актыўнасьці рабочых і сялян. У Сэвільлі рабочыя спрабавалі здабыць сабе зброю ў майстэрнях зброі. Паліцыя адкрыла стральбу па рабочых. Адзін рабочы забіты, 20 паранена. Далей рабочыя, на чале з комуністымі, імкнуліся захапіць рэспубліканскі клюб, але асада рабочых была адбіта сіламі паліцыі і войска. Горад абвешчан на ваенным стане.

У Андалузіі адбываюцца сялянскія хваляваньні, накіраваныя супроць поўфэадалаў буйных абшарнікаў, якія жорстка эксплёатуюць сялянскае насельніцтва. Блізу Більбао рабочыя атакавалі турму і вызвалілі ўсіх політычных зьняволеных. Непадалёк ад Більбао рабочыя імкнуліся захапіць у свае рукі кантроль над фабрыкамі і заводамі. Комуністыя выступалі пад лёзунгам: „рэспубліка павінна быць комуністычнай“. Паліцыя і войска нападалі на рабочых. Многа параненых.

Дэмонстрацыі рабочых і сялян, што адбываюцца ва ўсёй краіне, выклікаюць трывогу як гішпанскай, так і зарубежнай буржуазіі, „Дэйлі Тэлеграф“ піша „Гішпанія перажывае час керанічны і ніхто ня можа сказаць, што пераможа: ці конституцыйны ўрад, ці бальшавізм“.

Забастоўкі ў Сэвільлі

ПАРЫЖ, 17. Як паведамляе агэнства Гавас, у Сэвільлі (Гішпанія) рабочыя комуністыя вядуць энэргічную агітацыю, заклікаючы рабочых да забастоўкі. Забаставалі будаўнічыя рабочыя і фабрыка корак. З раду вёсак Сэвільскай вобласьці прыбываюць сяляне ў Сэвільле з комуністычнымі сьцягамі пад лёзунгам „Няхай жывуць саветы“.

Паліцыя прымае меры для недапушчэньня рэволюцыйных сялян у горад. Утвораны шматлівія арышты.

Адказны рэдактар **МІХ. ПЛАТАЎ.**

22-га красавіка а 6 гадзіне ўвечары ў памяшканьні залі паседжаньняў Гаркому КП(б)Б

СКЛІКАЕЦЦА

пашыраны пленум Менскага Гаркому ЛКСМБ

Парадак дня:
1. Аб стане паходу гарадской організацыі КСМ за аўладаньне тэхнікай (дакл. Хэймана).
2. Аб рабочым забесьпячэньні (дакл. Рудніцкага).
3. Аб задачах саветаў у колгасным будаўніцтве (дакл. Янковіча).
4. Аб становішчы комсамольскай работы ў ВТУЗ'ах і тэхнікумах (дакл. Фрумкіна).

Сэкратар Менгаркому ЛКСМБ **Янковіч.**

Галоўлітбел № 599